# Тэрыторыя старту



Праект Яўгена Палавінскага "Гульня ў класікі"

"Славянскі базар у Віцебску" штогод прапануе новыя праекты. Сёлета, да прыкладу, з'явілася "Тэрыторыя старту" — фестывальная пляцоўка ў Віцебскім дзяржаўным музычным каледжы імя Івана Салярцінскага. На ёй цягам форуму выступаюць адметныя маладыя калектывы Беларусі і Расіі.

Сёння, 11 ліпеня, ансамбль лаўрэатаў міжнародных і ўсерасійскіх конкурсаў "Трыа балалаек" прадставіць канцэрт "Ад струн да сэрца". Гэтая імпрэза — своеасаблівы майстар-клас выпускнікоў Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных, быццам у працяг леташняй лабараторыі народных інструментаў, што праходзіла на фестывалі па спецыяльнасцях "домра" і "балалайка".

## "ТУЦІ" АЗНАЧАЕ "РАЗАМ"

Адкрыццё ж праекта "Тэрыторыя старту" адбылося ўчора, калі сэрцы слухачоў захапіў ансамбль акардэаністаў "Туці" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з праграмай "Галавакружны акардэон". Гучалі разнастайныя арыгінальныя творы, пералажэнні, у тым ліку музыкі Яўгена Глебава, джаз.

— Склад нашага калектыву, заснаванага чатыры гады таму, штогод змяняецца, — расказала яго мастацкі кіраўнік, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык кафедры народнаінструментальнай музыкі БДУКМ **Вольга Немцава**. — Сыходзяць выпускнікі, з'яўляюцца першакурснікі. Мы ўдзельнічалі і перамагалі ў самых розных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях, выступалі на прэстыжных святочных пляцоўках, за адзін толькі навучальны год далі каля 20 канцэртаў. Цяперашні сольнік на "Славянскім базары" стане для нашых музыкантаў адным з самых запамінальных момантаў прафесійнай кар'еры. Яшчэ летась немагчыма было нават марыць, што нас запросяць на такі грандыёзны форум. Стварэнне "Тэрыторыі старту" — папраўдзе выдатная ідэя.



Ансамбль акардэаністаў "Туці"

## КОЗЫРЫ ДЖАЗ-КВАРТЭТА

У суботу ў рамках праекта выступіць "Козыраў квартэт" — зусім новы цалкам маладзевы джазавы калектыў, які толькі ўвосень адзначыць год свайго існавання. У складзе — выпускнікі БДУКМ і навучэнцы Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. Глінкі: Іван Лоскутаў (ударныя), Максім Бахар (тэнар-саксафон), Мікіта Млечка (бас-гітара). Больш падрабязна расказаў пра квартэт яго заснавальнік і кіраўнік **Уладзіслаў Козыраў** — малады выкладчык Гомельскага каледжа мастацтваў імя Н. Сакалоўскага, піяніст сімфанічнага аркестра Гомеля, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі:

— Рэпетыцыі праходзяць у Мінску, калі я прыязджаю. Граем джазавыя стандарты, але арыентуемся на сучасны джаз, таму на канцэрце прагучыць музыка пераважна XXI стагоддзя, у тым ліку дзве кампазіцыі майго аўтарства. Магчыма, неўзабаве з'явяцца і творы іншых удзельнікаў калектыву. Нас пазнаёміў саксафаніст Арцём Пузырэнка, з якім я вучыўся, а таксама граю ў яго калектыве Little One. Арганізаваўшы цяперашні квартэт, мы далі канцэрт у Гомелі (удзельнічаў і Арцём), быў аншлаг. Мой брат, які ўзначальвае ансамбль "Песняры", параіў даслаць відэазапіс арганізатарам "Славянскага базару" — і нас запрасілі. Гэта неверагодна! Сапраўдная "Тэрыторыя старту"! Жадаю і надалей пашыраць дыяпазон жанраў і стыляў, уключаючы эксперыменты па пераасэнсаванні народных музычных культур постсавецкай прасторы — Грузіі, Арменіі, Азербайджана і іншых.



Уладзіслаў Козыраў

## ЗГУЛЯЕМ У КЛАСІКІ?

Завершыць сёлетнюю "Тэрыторыю старту" эксперыментальны праект Яўгена Палавінскага "Гульня ў класікі". Гэтага крэатыўнага музыканта, мастака і дызайнера добра ведаюць у Віцебску — не столькі як трамбаніста сімфанічнага аркестра тамтэйшай філармоніі, колькі як аўтара безлічы самых смелых ідэй, якія творца не проста выказвае, а паспяхова рэалізоўвае. Да фестывалю Яўген падрыхтаваў не толькі канцэрт, дзе выступіць незвычайны "аркестр", складзены з найлепшых маладых сталічных салістаў, але і цікавыя гарадскія аб'екты, што ўжо прыцягнулі ўвагу мінакоў і сталі яркімі фотазонамі. Побач з Цэнтрам культуры "Віцебск" размясціўся надпіс і лагатып "Славянскага базару" — у адказ на апладысменты гучаць пазыўныя, якімі пачынаецца кожны канцэрт, а белыя ліхтары адна за адной запальваюцца сінім. Калі ж запляскаць у далоні побач з фігурай Пушкіна ля гімназіі № 3, што носіць яго імя, можна пачуць вершы паэта, прычым розныя.

— Што, калі сыграць класіку не вельмі класічнымі інструментамі? — задае рытарычнае пытанне **Яўген Палавінскі**. — Вынік вы пачуеце на канцэрце, дзе акадэмічныя інструменты з'яднаюцца з электронікай. Найбольш складана аказалася знайсці адпаведнага музыканта, які валодае секвенсарным сінтэзатарам. Гэта ўдзельнік былога гурта "Срэбранае вяселле" мінчук Зміцер Гаўрылік — аранжыроўкі раблю разам з ім. Здараюцца і спрэчкі, але выключна творчыя, паразуменне знаходзім заўсёды. Для мяне ж важна не проста перайначыць, "асучасніць" мелодыю, а падкрэсліць, крыху нават утрыраваць ідэю кампазітара. Сярод іншых удзельнікаў калектыву — прадстаўнікі розных пакаленняў: дацэнт нашай Акадэміі музыкі Сяргей Працэнка, у якога я вучыўся, трубач з Вялікага тэатра Беларусі Веніямін Рыбакоў, музыкант са сталічнай філармоніі Варвара Царук, для якой мы прыдбалі электраарган, знакаміты саксафаніст і дырыжор, кіраўнік створанага ім аркестра BELSAXO, валтарніст Музычнага тэатра Сяргей Тупіцын, Таццяна Свірыдава, што грае на электрабарабанах. Будуць і сольныя нумары, і ансамблевыя, незвычайная атмасфера нетрывіяльнага выканання музыкі Баха, Качыні, Барадзіна, П'яцолы. Падобныя выступленні мы ладзілі ў Віцебскай філармоніі, у палацы Паскевічаў у Гомелі. Але для "Славянскага базару" падрыхтавалі і сюрпрызы.

Надзея БУНЦЭВІЧ